Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны
музей Якуба Коласа

# КАЛАСАВІНЫ

**Якуб Колас і яго акружэнне**

**Матэрыялы навуковай канферэнцыі,
прысвечанай 50-й гадавіне смерці
народнага паэта Беларусі Якуба Коласа
3 лістапада 2006 г., Мінск**

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2007

УДК 821.161.3.0(082)
ББК 83.3(4Беи)я43
К17

Складальнікі:
дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага
музея Якуба Коласа *З. М. Камароўская*;
намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба
Коласа *Г. І. Зайцава*

**Каласавіны.** Якуб Колас і яго акружэнне : матэрыялы навук.
К17 канф., прысвеч. 50-й гадавіне смерці нар. паэта Беларусі Якуба Коласа, 3 лістап. 2005 г., Мінск / склад. З. М. Камароўская, Г. І. Зайцава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2007. — 196 с. : іл.
ISBN 978-985-476-535-8.

Зборнік тэзісаў і паведамленняў – працяг вывучэння шматграннай спадчыны народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Аўтары звяртаюцца да невядомых першакрыніц, даследуюць актуальныя праблемы коласазнаўства. Матэрыялы падаюцца ў аўтарскай рэдакцыі.

Адрасаваны навуковым работнікам, выкладчыкам, коласазнаўцам.

**УДК 821.161.3.0(082)**
**ББК 83.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-476-535-8**

© Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны
музей Якуба Коласа, 2007

**Алена Ігнацюк**

## Канцэпцыя "асобы" і фантасмагорыя ў "Казках жыцця " Якуба Коласа

Фантасмагарычныя вобразы ў культурах народаў свету. Яны нібыта з жывапісу пячорнага чалавека – палеалітычныя жанчыны (з галавою птушкі), якія магічна чырвонавохрыста свецяцца. Ці з антычнасці... Як міфалагічныя кентаўры – людзі-жывёліны. Адным словам, яны з міфа, у якім касмаганічным узорам тчэцца ўпарадкаваны свет, і дзе богі (духі) пераўтвараюць *хаос у космас.* Невыпадкова, што ў «Казках жыцця» Я. Коласа часты матыў: «На свеце вечнага няма нічога, жыццё мяняецца. Адна форма змяняе другую, і так бесперастанку» (Казка «Страказа».) Мадэль вертыкальнага свету, дзе абавязковыя «верх-ніз», у казцы «Адзінокі курган» прачытваем як упарадкаванне прасторы праз зліццё вобразаў: падаючай на зямлю *зоркі і адзінокага кургану*, у выніку падзення метэарыту, праз перасатварэнне нябеснай вышыні ў гарачы зямны попел кургана. Касмаганічную праграму выконваюць і некаторыя вобразы-сембіёзы. Напрыклад, вобраз «жука-страказы». Я. Колас піша: «З пясчанага і неглыбокага дна возера выпаўзлі на бараг дзіўныя, зеленаватага колеру нейкія істоты, падобныя на вадзяных жукоў... Шкарлупіна раскідвалася, спаўзала, і з жука выклёўвалася маладзенькая, далікатная страказа».

Калі архетыповыя вобразы перанесці ў кантэкст класічнай мадэлі свету з яе неўміручым «антычным законам гармоніі», спалучыць іх з паняццем «асобы», з тлумачэннем гэтага паняцця ў культурах народаў свету, то для нас важна бачыць у вобразах-архетыпах лагічны цэнтр – як сістэму духоўных каштоўнасцей , дзе збіраюцца, напрыклад, ідэі не толькі архаічнага міфалагізму, але

праглядаюцца напрамкі сучаснага глабальнага індывідуалізму. І яны неаддзельныя ад такога пачуцця *свабоды*, што як нашэсце варвараў: франкаў ці готаў (ужо ў сярэдневякоўі), якія выконвалі сваю «касмаганічную» місію: асвойвалі карту Еўропы, для таго каб *хаос* завяршыўся *космасам*. Бо, як адзначыў Франсуа Гізо ў кнізе «Гісторыя цывілізацыі ў Еўропе», «асалода ад асабістай незалежнасці, здавальненне ад самаўладнага распараджэння сваёй свабодаю, сваімі сіламі, сярод усіх скажэнняў свету і жыцця, выкананне прыгод, нечаканасцей, пераменаў, небяспечнасцей – вось пачуццё, якое пераважае ў варварах».

Лес «Казак Жыцця» апавядае пра цэласнасць этнасу, нагадвае краіну, жыхары якой памятаюць пра сваю гістарычную традыцыю, пра кроўнага продка. Невыпадкова, што ў цэнтры такога лесу павінен быць «дуб»- дрэва бога Перуна.

Аднак цар-дрэва ў «старасвецкім лесе» з цяжкасцю ўтрымлівае сваё міфалагічнае славянскае царства, ды і «славянскі рай» больш нагадвае рух *буры*: «Страшная бура завыла над цёмнаю пушчай... Загулі магутныя дубы, і громам грымелі іх чорныя жэралы... Усе дрэвы бушавалі сваімі галасамі, і ўвогуле выйшла такая страшная музыка, што здавалася, злыя духі пазрываліся з ланцугоў і спраўлялі тут сваё ігрышча» (Казка «Стары лес»).

Антрапаморфны малюнак космасу ў «Казках жыцця» набывае этнапалемічны сэнс: у палеміцы пра ідэальную асобу бяруць удзел многія персанажы лесу. Напрыклад, *старая гара* (маці) так павучае дачушку *крынічку*: «Наўперад ты добра падумай, а ўжо тады выбірай свой лёс, ...ты пойдзеш туды, куды цябе цягне твая цікавасць, ...сярод чужынцаў ты згубіш свой воблік, сатрэшся з твару зямлі»).

Найбольш выразны той, хто хоча жыць па «адвечнаму закону» лесу – архаічнаму. І ён амаль ніколі не пакідае лес ( Чытач можа асацыіраваць яго з этнічным беларусам – *тутэйшым, краёвым*). І пры ўсім гэтым – кожны чакае росквіту жыцця ў лесе . Толькі як дайсці, даляцець да лепшага жыцця – не ведае. Праз вобраз «далечы» ў казках «Даль», «Хмарка» пісьменнік, як думаецца, раскрывае ідэю нацыі. Бо ж нацыя – гэта тая сацыяльна – культурная з'ява, што, як і «далеча», мае рысы «няпэўнасці, імгненнасці, але якая адразу кідаецца ў вочы ... ў намітцы сіняй тугі».

У «Казках жыцця» знаходзім шмат архетыпаў: гара, жывая вада, бабка-бабылька, дзед, шлях, даль, крыж, дрэва і інш. Напрыклад,

бабка-бабылька (у казцы «Цвіркун») выступае ў функцыі Бабы-Ягі: жыве ля печы «з прыпечкам, падпрыпечкамі, ямкамі з двух бакоў прыпечка. Бабка-бабылька заграбала сюды жар і прысыпала яго попелам, каб не гаслі вугельчыкі, што ажыўляла хатку-хібарку». Бачна, што ў казцы Я. Коласа сімвалічная бабка падобная на жрыцу, якая праводзіць абрад ініцыяцыі: дапамагае *цвіркуну* ажыўляць яго музыку, калі да таго прылятаюць «розныя матылькі», быццам душы продкаў.

«Лес» увесь свеціцца формамі рытуалізаванага жыцця. Як вядома, у шумераў «рытуал» – гэта дзеянне. Напрыклад, для кожнага дзеяння ў шумерскай культуры існавала яго «ме» – ідэя, якая выражала волю чалавека да выяўлення быцця. Значыць, адсутнасць рытуальнага руху – адсутнасць жыцця. У філасофіі Я. Коласа рытуал – гэта парадак у межах лесу, «адвечны закон», устаноўлены з самага ўтварэння свету, як выяўленне пэўнай гармоніі дабра і хараства». У казцы «Супраць вады» *азярцо*, па віне чалавека, *старога дзеда*, які не «даў волі вадзе», страціла свой рытуалізаваны парадак, які павінен быў адлюстравацца ў «жывой вадзе» – чыстай і празрыстай («Вада – такая рэч, што не можа доўга стаяць на месцы: спакой вадзе - пагібель»).

Прыгадаем, *вада* ў казках звязваецца з пачаткам стварэння сусвету, дзе яна сімвалізуе хаос. Але ў тэксце Я. Коласа на першым плане – ачышчальная функцыя вады.

А вось яшчэ прыклад: *Чалавек-кажух* – гэта «стары Анісім» («Дзед так шанаваў свой кажух, ніколі з ім не раставаўся і так крэпка з ім зжываўся, што трудна было пазнаць, дзе пачынаўся дзед і дзе канчаўся кажух»). У беларускіх міфах кажух часцей сівал *багацця*. Але ў казцы Я. Коласа *вывернуты кажух*, *кажух у латках і дзірках*, паказвае на прысутнасць «свету продкаў» у жыцці Анісіма – *вечнага старога*.

«Казкі жыцця» можна прачытваць як адну новаўтвораную казку пра старажытны міф: пра яго змест і структуру, пра асаблівасці міфалагічнага мыслення, заснаванага на «прынцыпе тоеснасці», пра касмаганічны закон.

Міф – быццам «у вачах цёмнай бясконцай ночы»: гэта – «прыгоства чараў, павабнасць таемнасці, страх цемры, велізарнасць нябесных прастораў і жах перад бясконцасцю і бязмежнасцю сусвету». Абавязковы персанаж такой таемнасці – *Лясун* (казка «Залаты прамень»): «Лясун надзяваў на сябе адзежу, сатканую з лісця і з танюсенькіх нітак, што пралі русалкі з кудзелі-моху, а на

галаву ўскладаў карону, перавітую гірляндамі дзеразы з блуклівымі агеньчыкамі, і выходзіў на горку. У руках яго была бліскучая палка, зробленая невядомымі майстрамі з гнілушак, і гэтаю палкаю ён праводзіў па струнах арфаў, што развешвалі павукі ад дрэва да дрэва». Лесуна цяжка назваць злым духам. Ён жа абараняе лес. У яго дзеяннях, прамовах пазнаецца старажытны рытуал, мэта якога – аберагчы *лясны закон* ад забыцця.

І ўсё ж усе гукі такога міфа памкнёныя, найперш, да аднаго голасу – голасу «асобы». Значыць, у цэнтры «Казак жыцця» *ідэальны чалавек*, які шматпланавы. Ён нібы па-за заслонкай лесу. Яго ніхто зрокава не бачыць, але ўсе адчуваюць, цытуюць. Ён у «МіФЕ» (як яго цэнтр, дзе цалкам тлумачыцца жыццё чалавека сіламі прыроды ці здарэннямі ў ёй) і ён за мяжой міфа (як духоўны – маральна арыентаваны чалавек: прыгожы, свабодны, моцны і г. д.). Ён актыўнадзейны, жыве з думкай, што «ўсякае стаянне на месцы пераходзіць у звычайны застой». Ён шчаслівы, як радасць адноўленага жыцця; ён нібыта «малады дуб» у казцы «Чыя праўда?»: хоча быць відушчым, любіць жыццё. Ён гуманіст: «Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і можа мець сілу і права» (Казка «Процiў вады»).

Персанажы «Казак жыцця» вераць у цуды. Такая вера – як вынік пераходу вобразнага міфалагічнага мыслення чалавека (дзе атаясамлены ява і сон) да індывідуальных тэорый, калі праз захапленне «цудам», праз засяроджанасць на звышрэальным глыбей раскрываецца паняцце *асобы* ці *персоны*. Цікавыя для нас развагі інтэлектуалаў Сярэдневякоўя аб «персоне». Прыгадваецца прытча «Пра дары божыя» ў інтэрпрэтацыі Бертольда Рэгенсбургскага. Бертольд «Божымі дарамі» называе: 1) нас саміх, нашае цела (як адзінства душы і цела); 2) нашу службу (чалавек павінен быць тым, кім жадае бачыць яго бог); 3) нашу маёмасць; 4) наш час; 5) нашу хрысціянскую любоў. Аднак у «Казках жыцця» хрысціянскія матывы не адразу прачытваюцца. У лесе правяць рытуалам паганскія духі. А вось за межамі міфалагічнага лесу знаходзіцца такая ж самая «персона», якую ўбачыў хрысціянін Бертольд.

Дык з якім рэальна-канкрэтным ландшафтам аўтар «Казак жыцця» звязвае свае думкі пра ідэальную асобу ў грамадстве. Як піша М. Лужанін, «казкі, у большасці сваёй, напісаны да выпадку ... і *нясуць у сабе зерне сапраўдных жыццёвых праяў*». Казкі тварыліся ў розныя гады. Пэўна, задумваліся яны і на палескім матэрыяле, калі, напрыклад, у Пінску, яшчэ ў 1912 годзе, Я. Колас

напісаў трынаццаць апавяданняў («Малады дубок і інш.). Таму сярод насельнікаў казачнага лесу чытач заўважае і палешука. Архетыповы паляшук – надта ўжо падобны на таго «цвіркуна», які «жыў на печы, і ўсю ноч цвірчэў. Песня яго была просценькая, без усякіх кампазітарскіх завітушак. Кампазітарам жа быў сам цвіркун. Самаю адданаю слухачкаю яго была бабка-бабылька». Сучасны (як і этнічны) паляшук творыць сваю песенную душу з асалодаю, зрэдку пакідаючы сваю сядзібу – архетыповы прыпечак – як пячурку-свяцілішча – сакральнае месца – уваходзіны ў краіну продкаў. *Прыпечак – гэта яго вышыня.* Асобы таленавітай. Асобы кемліва-тэмпераментнай.

# ЗМЕСТ

*Камароўская З. М.* Паэт і час ........................................ 3
*Мушынскі М. І.* Якуб Колас і Максім Лужанін ........................ 9
*Калеснік В. Л.* Максим Рильський в колі білоруських друзів (До питання дружби Максима Рильського, Янка Купали і Якуба Коласа) ........................................ 21
*Міцкевіч М. К.* "Кроплі і слёзы" Якуба Коласа ........................ 26
*Шамякіна А. І.* Якуб Колас і Іван Шамякін ........................ 42
*Ненадавец А. М.* Перапіска Якуба Коласа і Сяргея Гарадзецкага 50-х гадоў мінулага стагоддзя ........................ 45
*Голуб Т. С.* Якуб Колас і Максім Лужанін (Да праблемы выбару крыніцы асноўнага тэксту "Казак жыцця") .............. 51
*Нячай В. Ф.* "Казка пра лілею і пра пташыну-песняра" (Паэма "Сымон-музыка" Якуба Коласа ў беларускім кіно і на сцэне)........................................ 60
*Клімуць Я. І.* Паэзія Якуба Коласа і Паўло Грабоўскага (параўнальны аналіз) ........................................ 73
*Назараў В. Ф.* Акружэнне Якуба Коласа, выяўленае на старонках яго аўтабіяграфій ................................ 77
*Гарон А. М.* "Апошні з сям'і Юркі..." ........................................ 84
*Корань В. А.* Якуб Колас і Уладзімір Дубоўка: з гісторыі перапіскі ........................................ 94
*Казыра К. А.* Новыя дарчыя надпісы Якуба Коласа ................ 98
*Конан Ул. М.* Філасофскія погляды Якуба Коласа: пастаноўка праблемы ........................................ 103
*Белакурскі В. М.* Колас-філосаф ........................................ 114
*Жураўлёў В. П.* Дыялог канкрэтыкі і сімволікі ў "Казках жыцця" Якуба Коласа ........................................ 117
*Ігнацюк А. Ул.* Канцэпцыя "асобы" і фантасмагорыя ў "Казках жыцця " Якуба Коласа ................................ 125
*Пяткевіч А. М.* Матыў роднай хаты як знакавай прасторы беларускага жыцця ў творчасці Якуба Коласа ................ 129
*Трус М. В.* "*Купіць зямлю, прыдбаць свой кут...*": ключавыя пытанні славянскага адраджэння першай трэці XX ст. ........................................ 133
*Мельнікава А. М.* Прастора ў творах Якуба Коласа ................ 140
*Шаладонаў І. М.* Тыпалогія праблемы мастака і творчасці ў прозе Тараса Шаўчэнкі і Якуба Коласа ........................ 144
*Драздова З. Ул.* Душа чалавека і душа народа ў трылогіі Я. Коласа "На ростанях" і паэме М. Гогаля "Мёртвыя душы" ........................................ 150